# СРОДКІ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

**Сродкі навучання беларускай мове —** спецыяльна створаныя дапаможнікі і матэрыялы, якія дазваляюць настаўніку беларускай мовы накіроўваць пазнавальна-практычную дзейнасць школьнікаў па авалоданні ведамі, уменнямі і навыкамі, садзейнічаць развіццю і выхаванню вучняў у час адукацыйнага працэсу.

Асноўным сродкам навучання з’яўляецца **падручнік**.

Падручнік па беларускай мове — гэта вучэбнае выданне, у якім змешчаны неабходны для засваення тэарэтычны матэрыял, разнастайныя практыкаванні для фарміравання, развіцця і ўдасканалення вучэбна-моўных, правапісных, маўленчых уменняў і навыкаў.

Асноўнымі функцыямі падручніка з’яўляюцца інфармацыйная (прадстаўлена тэарэтычная інфармацыя аб мове і маўленні, моўных адзінках розных узроўняў і іншае), сістэматызавальная (лінгвістычная тэорыя падаецца ў дакладна вызначанай сістэме, што дазваляе вучням усвядоміць сутнасць мовы як своеасаблівай сістэмы, элементы якой узаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены), трансфармацыйная (веды аб мове і маўленні з’яўляюцца асновай для фарміравання адпаведных уменняў і навыкаў пры выкананні вучнямі разнастайных практыкаванняў, змешчаных у падручніку), выхаваўчая (многія тэксты падручніка дазваляюць настаўніку сістэматычна і мэтанакіравана праводзіць маральна-этычнае, эстэтычнае, патрыятычнае і інш. выхаванне школьнікаў).

Як правіла, школьны падручнік складаецца з наступных структурных кампанентаў: вучэбных тэкстаў розных відаў, вучэбных заданняў (практыкаванняў), апарату арганізацыі працы, ілюстрацыйнага матэрыялу, апарату арыенціроўкі.

Вучэбныя тэксты, якія выкарыстоўваюцца ў падручніку, падзяляюцца на асноўныя і дадатковыя. У асноўных тэкстах (правілах) змяшчаецца лінгвістычная тэорыя пра сістэму мовы і маўлення, даюцца азначэнні паняццяў, пералічваюцца іх прыметы, робяцца неабходныя вывады і абагульненні. У дадатковых тэкстах прадстаўлены матэрыялы для даведак, заўвагі і іншыя. Матэрыял у падручніку размяжоўваецца ў залежнасці ад яго важнасці для засваення тэмы. З дапамогай умоўных абазначэнняў, колеру выдзяляецца матэрыял для азнаямлення, завучвання на памяць і інш.

Вучэбныя заданні (практыкаванні) прызначаны для фарміравання і ўдасканалення ўсіх прадугледжаных вучэбнай праграмай уменняў і навыкаў: вучэбна-моўных, правапісных, маўленчых.

Апарат арганізацыі працы ўключае ў першую чаргу пытанні і заданні, якія дазваляюць арганізаваць назіранне за моўнымі фактамі і з’явамі, накіроўваюць пазнавальна-практычную дзейнасць вучняў у працэсе фарміравання ўменняў і навыкаў.

Разнастайны ілюстрацыйны матэрыял: схемы, табліцы, малюнкі, рэпрадукцыі карцін і іншае — садзейнічае ўсвядомленаму і больш трываламу засваенню ведаў. Ён, як правіла, цесна звязаны з асноўным вучэбным

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тэкстам, наглядна ілюструе тое, пра што ў ім гаворыцца, а ў некаторых выпадках змяшчае звесткі, якія адсутнічаюць у тэксце.

Апарат арыенціроўкі (прадмова, змест, рубрыкі, умоўныя абазначэнні, сімвалы і інш.) дазваляе хутка арыентавацца ў змесце падручніка, знаходзіць у ім неабходную інфармацыю.

У падручніку звычайна ёсць і пэўныя даведачныя матэрыялы: міні-слоўнікі, рубрыкі «Пішы правільна», «Вымаўляй правільна» і іншыя, якія развіваюць у вучняў навыкі самастойнай працы, актывізуюць іх пазнавальную дзейнасць.

У сучасных падручніках па беларускай мове выкарыстоўваюцца розныя спосабы падачы новага матэрыялу (увядзення новых ведаў). У залежнасці ад складанасці тэмы, узроставых асаблівасцей школьнікаў, іх здольнасці ўспрымаць і аналізаваць інфармацыю, праводзіць назіранні аўтары падручнікаў выкарыстоўваюць індуктыўны, дэдуктыўны ці індуктыўна-дэдуктыўны спосаб прад'яўлення інфармацыі. Індуктыўны спосаб пашыраны ў падручніку для 5 класа. Гэта абумоўлена тым, што на пачатковым этапе вывучэння сістэматычнага курса беларускай мовы неабходна фарміраваць у вучняў уменне назіраць за моўнымі фактарамі, аналізаваць іх, рабіць неабходныя абагульненні і вывады. Як правіла, вучэбная інфармацыя тут падаецца наступным чынам: матэрыял для назірання (словы, сказы, тэкст, малюнкі), пытанні і заданні да гэтага матэрыялу і вывад ў выглядзе азначэнняў і правіл.

Дэдуктыўны спосаб дастаткова часта выкарыстоўваецца ў падручніку для 7 класа, многія параграфы якога пабудаваныя наступным чынам: асноўны тэкст (правіла) і сістэма практыкаванняў. Гэта тлумачыцца тым, што моўны матэрыял, які вывучаецца ў раздзеле «Марфалогія і арфаграфія», часта з'яўляецца зусім новым для вучняў, дастакова вялікім па аб'ёме і складаным для разумення.

У падручніках для 8 і 9 класаў сустракаецца індуктыўна-дэдуктыўны спосаб падачы інфармацыі. Сутнасць яго заключаецца ў тым, што спачатку прапаноўваюцца практыкаванні і заданні, у працэсе выканання якіх адбываецца першаснае азнаямленне з моўнай з'явай. Затым ідуць тэкст правіла і практыкаванні на фарміраванне ўменняў і навыкаў.

У сучасных падручніках ёсць спецыяльныя матэрыялы, якія дазваляюць арганізаваць паўтарэнне на розных этапах адукацыйнага працэсу: у пачатку вучэбнага года, паралельна з вывучэннем новай тэмы, у канцы вывучэння тэмы ці раздзела, у канцы навучальнага года.

Акрамя падручніка, у працэсе навучання беларускай мове выкарыстоўваюцца і іншыя **вучэбныя і вучэбна-метадычныя выданні**: вучэбна-метадычныя дапаможнікі для настаўнікаў, дыдактычныя матэрыялы, зборнікі практыкаванняў, слоўнікі, рабочыя сшыткі, матэрыялы для факультатыўных заняткаў і іншыя). Усе яны разам з падручнікам складаюць вучэбна-метадычны комплекс па беларускай мове.

Вучэбны працэс становіцца больш эфектыўным, калі на ўроку выкарыстоўваюцца **нагляднасць і тэхнічныя сродкі навучання (ТСН).**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Наглядныя сродкі навучання падзяляюцца на зрокавыя (візуальныя), слыхавыя і зрокава-слыхавыя.

Да зрокавых сродкаў нагляднасці адносяцца табліцы, схемы, рэпрадукцыі карцін, малюнкі, фотаздымкі, слайды і іншыя. На ўроках беларускай мовы найчасцей выкарыстоўваюцца табліцы і схемы, з дапамогай якіх можна падаць лінгвістычны матэрыял у сістэматызаваным, абагульненым выглядзе.

Сродкам слыхавой нагляднасці з'яўляецца, напрыклад, гуказапіс. Ён дазваляе прадэманстраваць узорнае маўленне, звярнуць увагу на арфаэпічныя і акцэнталагічныя нормы беларускай літаратурнай мовы, інтанаванне моўных адзінак, садзейнічае ўдасканаленню ўменняў ствараць вусныя звязныя выказванні.

Традыцыйнымі сродкамі зрокава-слыхавой нагляднасці з'яўляюцца вучэбныя кінафільмы і кінафрагменты.

Сучаснымі тэхнічнымі сродкамі навучання з'яўляюцца камп'ютар, праектар, інтэрактыўная дошка (ІД) і іншыя. Значныя дыдактычныя магчымасці камп'ютарных сродкаў дазваляюць забяспечыць высокі ўзровень нагляднасці вучэбнага матэрыялу, інтэнсіфікацыю працэсу навучання, больш высокі тэмп урока, актывізацыю пазнавальнай дзейнасці вучняў, падрыхтоўку іх да жыцця ва ўмовах інфармацыйнага грамадства. На ўроках беларускай мовы камп'ютарныя сродкі выкарыстоўваюцца і на этапе азнаямлення школьнікаў з новым матэрыялам, і пры фарміраванні ўменняў і навыкаў, і з мэтай кантролю ўзроўню ведаў, ступені сфарміраванасці ўменняў і навыкаў.

Выкарыстанне інтэрактыўнай дошкі як дэманстрацыйнага сродку нагляднасці пры тлумачэнні новага матэрыялу асабліва эфектыўна пры рабоце з дынамічнымі і звычайнымі табліцамі, алгарытмамі, схемамі. Праца на ІД пры выкананні трэніровачных практыкаванняў дазваляе значна павялічыць тэмп урока без зніжэння якасці засваення вучнямі лінгвістычнага матэрыялу.

Прымяненне камп'ютара з мэтай кантролю ведаў, уменняў і навыкаў вучняў дазваляе якасна правесці тэсціраванне, кантрольную работу і дае магчымасць атрымаць агульныя звесткі пра вынікі кантролю з указаннем колькасці памылак і тых правіл, на якія гэтыя памылкі былі дапушчаныя. Пры гэтым настаўнік эканоміць час на праверцы пісьмовых работ вучняў, але мае поўнае ўяўленне пра тое, як яны засвоілі пэўныя тэмы.

Аднак неабходна памятаць, што камп'ютарныя сродкі неабходна спалучаць з іншымі сродкамі навучання.

*У.П. Саўко.*

*Саўко, У. П. Сродкі навучання беларускай мове / У. П. Саўко // Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў. У 12 т. Т. 7 Беларуская мова. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017. – С. 284–287.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ